# Сучасная гістарыяграфія аб скасаванні ўніяцкай царквы на Беларусі

Філатава А. М. Інстытут гісторыі НАНБ

Значнай падзеяй, як канфесійнай, так і палітычнай, было скасаванне ў 1839 г. на тэрыторыі заходніх губерняў Расійскай імперыі ўніяцкай царквы. Даволі значная дарэвалюцыйная расійская гістарыяграфія прадстаўляла акт 1839 г. як працэс «воссоединения» з праваслаўнай царквой, які дазволіў павялічыць колькасць праваслаўных вернікаў, г.зн. колькасць «русского» насельніцтва.

Сучасныя расійскія даследчыкі працягваюць надаваць гэтаму пытанню значную ўвагу. Так, У. Фёдараў адзначаў, што ў час праўлення Мікалая I «воссоединение» уніятаў з рускай праваслаўнай царквой было заклікана вырашыць дзве задачы: пазбавіць рэлігійнай апоры палякаў у Заходнім краю і разам з тым быць сродкам «обрусения западных губерний России, некогда входивших в состав Польши». Па меркаваннях аўтара, зачэпкай для правядзення «воссоединения» стала лістападаўскае паўстанне 1830–1831 гг. у Польшчы [18, с. 205]. І. Смоліч пісаў, што 16 снежня 1839 г. праваслаўны мітрапаліт Філарэт (Драздоў) падрытаваў запіску у якой прадставіў план па ўз’яднанню ўнітаў з праваслаўнай царквой, які, як лічыў аўтар, быў прыведзены ў жыццё з невялікімі праўкамі [6, с. 340–341]. Цэнтрамі супраціўлення палітыцы ўрада, на думку І. Смоліча, з'яўляліся базыльянскія манастыры. Упорства базыльянак па розным прычынам не ўдалося зламаць аж да 1855 г. «Мятежников» перадавалі пад нагляд духоўных улад і рассялялі па праваслаўных манастырах [6, с. 344].

Аўтары працы «Западные окраины Российской империи» скасаванне ў заходніх губернях уніяцкай царквы лічаць вялікім поспехам палітыкі ўлад. Але, разам з тым, яны адзначаюць, што гэты акт не даў уладам «твердой уверенности в действительном ограждении массы бывших униатов, включая духовенство, от польского влияния». У вышэйшым бюракратычным коле, як пішуць аўтары, засталіся сумненні адносна матываў тагачаснага ўніяцкага епіскапа, а ў далейшым Літоўскага праваслаўнага мітрапаліта Іосіфа Сямашкі. Напрыклад, у 1843 г. дзяржаўны сакратар М. Корф,

убачыўшы, што Мікалай I не даваў асабістай аўдыенцыі Іосіфу Сямашку, дапусціў, што імператар прытрымліваўся прынцыпу: «Любят предательство, но предателя презирают». Скасаванне ўніяцкай царквы, па заключэннях даследчыкаў, значна павялічыла «площадь соприкосновения» праваслаўнай царквы з каталіцкай на нізавым прыходскім узроўні, а кампанія па «обращению униатов в православие» дала дадатковы стымул ідэолагам «русского дела». Бо менавіта ў 1830-х гг. гісторыкі Г. Устралаў і М. Пагодзін пачалі прапагандаваць ідэі аб «исконно русском» паходжанні русінскага насельніцтва ўсходніх зямель былой Рэчы Паспалітай [5, с. 108–111].

Што тычыцца даследаванняў польскіх навукоўцаў па гісторыі ўніяцкай царквы, то ў іх заўважаецца адрозны ад расійскай гістарыяграфіі канцэптуальны напрамак. Далучэнне ўніяцкай царквы тут праходзіць пад тэрмінам «знішчэнне» [22, 23, 24]. Адной з грунтоўных прац сучаснай польскай гістарычнай думкі па гэтай тэматыцы з'уляецца даследаванне М. Радвана. Ён разглядаў скасаванне ўніяцкай царквы і базыльянскага ордэна як элемент русіфікатарскай палітыкі ўрада, якая мела месца ў XIX ст. у розных формах і тычылася не толькі ўніяцкіх епархій, але і Віленскага ўніверсітэта, каталіцкіх епархій, кляштараў і парафіяльных школ [27, с. 142]. Л. Заштаўт адзначыў, што працэс разборкі былых уніяцкіх вернікаў зацягнуўся на доўгі час і праходзіў, у шэрагу выпадкаў, даволі складана. Так, па яго падлікам па перыяду 1844–1877 гг. існуе інфармацыя аб 258 карных працэсах над асабамі, якія адзначы ў дакументах, як «католики происходящие с бывшей унии» [29, с. 614].

Мірановіч А. адзначыў, што ў беларускай гістарыяграфіі пераважае погляд аб вялікім уплыве уніяцкага веравызнання на фарміраванне нацыянальнай свядомасці беларусаў. У сапраўднасці, лічыць аўтар, пры уніяцтве адбывалася латынізацыя і паланізацыя гэтага каталіцкага абраду. Поўная інтэграцыя была не магчымая з прычыны грамадскіх, культурных і моўных адрозненняў, раздзяляючых паслядоўнікаў лацінскага і уніяцкага абрадаў. Пры панаванні Мікалая I у змаганні за душы ўніятаў уключылася руская праваслаўная царква, якую падтрымлівалі дзяржаўныя ўлады. Прарасійская плынь мела таксама многа прыхільнікаў сярод уніяцкай іерархіі, якая жадала вызваліцца ад ролі пастыраў горшага

каталіцкага веравызнання. На погляд аўтара, у XIX ст. ніводная канфесія на Беларусі не спрыяла беларускаму нацыянальнаму адраджэнню [26, с. 5–17].

Радзік Р., аналізуючы сукупнасць вартасцей для фарміравання беларускай нацыі і разглядаючы рэлігійныя перадумовы гэтага працэсу, адзначаў, што ў 1839 г. беларусы былі пазбаўлены таго элементу іх культуры, які даваў найбольшыя планы для нацыянальнай эскалацыі іх беларускасці. Царскія ўлады, ліквідаваўшы уніяцкую іерархію, пазбавілі беларускае грамадства той праслойкі, якая мела найбольшыя шанцы, каб – як гэта склалася ва ўсходняй Галіцыі сярод украінцаў – актывізаваць беларускі нацыятворчы працэс і, маючы інстытуцкае заплечча, кіраваць ім на першай фазе развіцця [14, с. 277].

Значную ўвагу надаюць гісторыі уніяцкай царквы украінскія гісторыкі. Так, даследчыкі В. Бубеншчыкаў і П. Кралюк прыйшлі да высноў, што скасаванне царскім ўрадам уніі на беларускіх землях прывяло да таго, што нацыянальнае жыццё і нацыянальная свядомасць беларусаў ў XIX ст. развівалася павольнымі тэмпамі [1, с. 153].

Літоўскій даследчык Д. Сталюнас і рускі М. Далбілаў адзначылі, што ў асяроддзі былога вышэйшага ўніяцкага духавенства, а затым праваслаўнага, узнік план «присоединить» і каталікоў заходніх губерняў да праваслаўнай веры. Так, на думку Мінскага і Бабруйскага праваслаўнага епіскапа (былога ўніяцкага) Антонія Зубко каталікі «могут надеяться, что религиозным соединением прекратятся подозрения Правительства насчет мятежничества, столько им наскучившего» [4, с. 25].

У дачыненні да ацэнкі ролі гэтага палітычнага акта ў развіцці працэсу фарміравання беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці сярод беларускіх гісторыкаў існуюць розныя погляды: ад прызнання уніяцкай царквы ў якасці нацыянальнай і разгляд яе знішчэння як трагедыю для беларускай нацыянальнай ідэі да прызнання скасавання уніяцкай царквы як важнай падзеі для аднаўлення адзінства і цэласнасці беларускага народа.

Так, на думку С. Марозавай гісторыя Беларусі яшчэ не ведала такога маштабнага адначасовага і радыкальнага перакройвання яе канфесійнай мапы. І разглядаць яго трэба не толькі як скасаванне аднаго з рэлігійных інстытутаў, але як “вялікі цывілізацыйны

водступ”. У выніку на “беларускім эксперыменце духоўна-рэлігійнай інтэграцыі Усходу і Захаду” была пастаўлена кропка. Выкрасліўшы уніяцтва з расійскай статыстыкі, адзначыла аўтарка, свецкія і духоўныя ўлады пачалі выкрэсліваць яго з сэрца і памяці тутэйшага люду. Пры гэтым вялікая ўвага надавалася фармаванню адпаведнага менталітэту “уз’яднаных”, выпрацоўцы ў іх пачуцця ўдзячнасці за скасаванне іх веры. На дапамогу прыйшла афіцыйная гістарыяграфія імперыі, якая пачала ўсхваляць гэтае мерапрыемства, навязваць грамадству думку аб добраахвотным кіданні сваёй веры. Трагедыя беларускага народа, піша аўтар, у такой інтэрпрэтацыі набыла выгляд яго дабра [11, с. 251, 252].

Такая трактоўка падзей прыводзіць даследчыцу да наступнай высновы: запаланіўшы духоўную інфраструктуру беларускага грамадства, маскоўскае праваслаўе прыўносіла ў яго чужы нацыянальна-рэлігійны ідэал, чым наносіла ўдар па яшчэ не сфармаванай беларускай нацыянальнай свядомасці, якая абуджалася ў той час менавіта пад сцягам уніі [11, с. 259]. На яе думку, у выніку скасавання ўніяцкай царквы “гэтага адначасовага масштабнага перакройвання яе канфесійнай карты тэрыторыі Беларусі стала радыкальная змена суадносін хрысціянскіх веравызнанняў” [7, с. 137].

Падобныя высновы, на нашу думку, не зусім адпавядаюць рэчаіснасці ў адносінах да ацэнкі ролі ўніяцкай царквы, як каталізатара абуджэння нацыянальнай свядомасці. Асабліва калі мець на ўвазе тыя працэсы, якія адбываліся ў ёй у канцы XVIII–першай трэці XIX ст. Асноўны удар палітыкі Расійскай імперыі наносіўся па духавенству, аб чым сведчаць і даследаванні самой С. Марозавай. Што ж тычыцца народа, то як у першым, так і ў другім выпадку хваляванняў зафіксавана было няшмат, і адбываліся яны пры падбухторванні прыхаджан з боку духавенства і мясцовых памешчыкаў. С. Марозава пісала, напрыклад, што у сякрэтным данясенні у Св. Сінод восенню 1838 г. ад Літоўскага ўніяцкага епіскапа Іосіфа Сямашкі, адзначалася, што мясцовыя памешчыкі супрадзейнічаюць уніяцкай справе. На яго думку асаблівую небяспеку ўяўляюць губернскія прадвадзіцелі дваранства: віцебскага – Шадурскі і магілёўскага – Галынскі, а таксама былы полацкі прадвадзіцель дваранства – Беліковіч. Яны падбухторвалі ўніяцкіх святароў, абяцалі сваю апеку, абнадзейвалі

пераменай абставін, заступаліся за тых з іх, хто за сваю вернасць уніі падлягаў пакаранню Полацкай духоўнай калегіі. Мясцовыя дваранскія лідэры прапаноўвалі свае сродкі на друкаванне ўніяцкага служэбніка замест маскоўскага [11, с. 172–173].

Марозава С. лічыць, што 12 лютага 1839 г. завяршылася вайна самадзяржаўя з уніяй, або «апошні акт уніяцкай трагедыі» [25, с. 53]. Іншы пункт гледжання прадстаўлены В. Цяпловай. На яе думку, скасаванне ўніі духоўна злучыла ўсе часткі беларускага народа, якія былі расколаты ўніяй, у адзінае цэлае. А падрыў паланізма і каталіцызма прывёў да паступовага вяртання беларусаў да вытокаў традыцыйнага для насельніцтва веравызнання (праваслаўя) [15, с. 45].

Церашковіч П. палічыў, што скасаванне уніяцтва ўскладніла працэс фарміравання беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці і выглядзеў гэты працэс дастаткова лагічным, заканамерным крокам з пункту гледжання расійскай адміністрацыі, вынікам рэалізацыі паслядоўнага і доўгатэрміновага праекта [16, с. 76].

На думку С. Токця, існаванне уніяцкай царквы на тэрыторыі Беларусі з’яўлялася надзвычайнай істотнай умовай для ўзнікнення і развіцця беларускай (ці літвінскай) нацыянальнай ідэі, пабудаванай на групе этнічнай свядомасці і гістарычных традыцый ВКЛ і адрознай, як ад польскай нацыянальнай ідэі, так і ад расійскай. Ліквідацыя ж уніяцкай царквы, лічыць аўтар, азначала знікненне гэтага канфліктнага фактару і спараджала брак пачуцця адрознасці ў масавай свядомасці беларусаў, што пазбаўляла нацыятворчы працэс дынамізму і надавала яму пакутліва замаруджаны ход [17].

Няпэўнасць у далейшым лёсе уніяцкай царквы гуртавала святароў і вымушала іх сумесна адстойваць свае інтарэсы. Самай папулярнай формай пратэста супраць падрыхтоўкі да скасавання Берасцейскай ўніі быў збор подпісаў пад петыцыямі. Але трэба адзначыць, што асноўную незадаволенасць выклікаў замах на знешнюю атрыбутыку уніяцтва. Увядзенне ва ўжытак кніг выдавецтва маскоўскага Сіноду ў 1834–1835 гг. выклікала значна большую хвалю пратэстаў, чым факт скасавання уніі ў 1839 г., які прайшоў амаль незаўважна. Гэта прывяло да таго, што уніяцкім святарам у выпадку далучэння да праваслаўя было дазволена па-ранейшаму насіць вопратку каталіцкага ўзору, галіць бараду і інш.

Немалаважна і тое, што захоўваўся status quo у матэрыяльным забеспячэнні святарства. Ідэйнымі кіраўнікамі незадаволеных святароў часцей за ўсё рабіліся манахі-базыльяне альбо святары, высвечаныя ў цалібаце [8, с. 133].

Засяроджваюцца на дадзенай палітычнай падзеі і сучасныя беларускія гісторыкі. У артыкулах і манаграфіі А. Філатавай абгрунтаваны цэлы комплекс аб’ектыўных і суб’ектыўных абставінаў, што прывёў уніяцкую царкву да скасавання. Сярод іх супярэчнасці паміж белым і чорным уніяцкім духавенствам, змена палітычнага курса Мікалая І, паўстанне 1830–1831 гг. і інш. Аўтар, абапіраючыся на архіўныя і гістарыяграфічныя даныя, не лічаць уніяцтва «нацыянальнай рэлігіяй», але і «воссоединение» яго з праваслаўнай царквой разглядае, як аспект урадавай палітыкі, накіраванай на ўмацаванне пазіцый праваслаўнай царквы, усталяванне яе пануючага становішча ў заходніх губернях Расійскай імперыі [20, с. 372–375; 19, с. 77]. А. Філатава адзначала, што з першага падзелу Рэчы Паспалітай да Полацкага сабора 1839 г. уніяцкая царква прайшла вельмі цяжкі шлях. Яе з дзвюх бакоў цягнулі да сябе праваслаўе і каталіцтва. А беднае і слабаадукаванае уніяцкае духавенства, дробная шляхта і прыгоннае сялянства не маглі супрацьстаяць урадавай палітыцы і здрадзе вышэйшага духавенства [3, с. 20]. Пры далучэнні беларуска-літоўска-украінскіх зямель да Расійскай імперыі ўраду патрэбна была падтрымка шляхты – вышэйшага саслоўя тэрыторыі, якое, ў асноўным, спаведала каталіцтва. І гэта відавочна было адной з прычын, згодна з якой дастаткова доўгі час урад практычна не закранаў былую пануючую канфесію – каталіцтва. Да канца 20-х гг. XIX ст. уніяцтва, як з боку каталіцкага духавенства, так і з боку ўраду, лічылася складовай часткай каталіцтва («римские католики обоих обрядов«), вернікамі гэтай канфесіі былі прыгонныя сяляне, мешчане і не вялікая частка беднай шляхты. Відаць таму гэтая канфесія, самая вялікая по колькасці вернікаў, была неўплывовай ў краі. Для праваслаўных іерархаў было відавочным, што папоўніць нешматлікую праваслаўную канфесію на тэрыторыі беларуска-літоўска-украінскіх губерняў можна толькі за кошт уніатаў.

Даволі востра і дыскусійна ў даследаваннях беларускіх даследчыкаў гучыла пытанне аб ролі ліквідацыі ўніяцкай царквы для кансалідацыі беларускага этнасу. На думку А. Філатавай

шматканфесійнасць беларусаў не спрыяла кансалідацыі народу. У 1839 г. імкнне шэрагу ўніяцкага духавенства перайсці ў каталіцтва, а не ў праваслаўе прывяла да некаторага расколу не толькі сярод духавенства, але і вернікаў [28, с. 201, 202].

Швед В. вылучыў прычыны, якія, па яго думку, стрымлівалі нацыянальнае развіццё беларусаў у 1794–1863 гг.: скасаванне бацькоўскай веры– уніяцтва і насаджэнні адзінай веры – рускай праваслаўнай царквы; русіфікацыя і паланізацыя насельніцтва Беларусі; расійская і польская сістэмы адукацыі; адсутнасць рэзка адметных рыс беларускай культуры, насаджэнне культуры і мовы велікарускага этнасу [21, с. 345–346].

Лыч Л. нагадваў, што ўніяцтва магло б у іншых гістарычных умовах і абставінах ператварыцца ў дзяржаўную рэлігію, бо “калі каталіцкая царква ад пачатку, праваслаўная – ад часу залежнасці ад Масквы з’яўляліся інструментам дэнацыяналізацыі духоўнага жыцця беларусаў, дык уніяцтва, калі толькі не перашкаджалі яму знешнія сілы, з павагай ставіліся да іх гістарычных традыцый, культуры і мовы, садзейнічала ўжыванню яе ў богаслужэнні, што станоўча адбівалася на этнічнай, нацыянальнай самасвядомасці самага карэннага насельніцтва нашага краю [9, с. 68]. Тое, што “адбылося ў 1839 г. у лёсе велізарнай колькасці беларусаў, ніяк не назавеш радавой падзеяй”, бо беларуская зямля яшчэ не ведала такога буйнамаштабнага і кароткага па часе пераходу (у абсалютнай большасці выпадкаў прымусовага) людзей з адной веры ў другую. Па той прычыне, лічыць Л. Лыч, што праваслаўнае духавенства ў Беларускім краі зыходзіла толькі з інтарэсаў рускага, каталіцкая царква – пераважна з інтарэсаў польскага народаў, былым уніятам, адданым традыцыям сваіх продкаў, з гэтых дзвюх бед вельмі няпроста было спыніцца на нейкай адной. Дзесяцігоддзямі рабіўся такі выбар. На працягу жыцця аднаго пакалення многім даводзілася па некалькі разоў мяняць веру, так і не далучыўся арганічна ні да адной з іх. Гэта, на думку аўтара, тлумачыць, чаму сярод большасці беларусаў ніколі не было сапраўдных рэлігійных фанатыкаў [10, с. 135, 136].

Падокшын С. паставіў пытанне аб тым, ці магло лі стаць уніяцтва нацыянальнай царквой? Ён лічыў, што існавала толькі тэндэнцыя ператварэння уніяцтва ва ў нацыянальную беларускую царкву, але перашкодай ў рэалізацыі гэтай тэндэнцыі з’явіўся шэраг

прычын, сярод якіх: паланізацыя і каталізацыя “вярхоў”, забарона уніяцтва на Полацкім царкоўным саборы ў 1839 г. і інш. Урад Расійскай імперыі, на думку аўтара, не даў магчымасці уніяцтву ператварыцца у нацыянальную рэлігію [13, с. 105].

Расійскія і польскія даследчыкі захоўваюць дастаткова традыцыйныя погляды на праблему скасавання ўніяцкай царквы. Пры панаванні ў расійскіх гісторыкаў заключэнняў аб станоўчым выніку 1839 г. («воссоединение» уніяцтва з праваслаўнай царквой), асобныя беларускія гісторыкі, асабліва ў канцы 80–пач. 90-х гг. ХХ ст., прытрымліваліся думкі аб яго негатыўным уплыве, даказваючы рэальныя магчымасці ўніяцтва стаць «нацыянальнай рэлігіяй», кансалідуючай сілай для беларускай нацыі: як для палякаў – каталіцтва, а для рускіх – праваслаўе. Праўда, такі падыход знайшоў шэраг крытычных заўваг. Напрыклад, А. Вернікоўская падкрэслівала, што пры вывучэнні ўніі беларускія аўтары імкнуцца абгрунтаваць заканамернасць існавання ўніі на беларускай тэрыторыі і «извечность» імкнення беларусаў да стварэння незалежнай ад Польшчы і Расіі царквы. Беларускія аўтары, па яе словах, ігнаруюць важнейшыя вынікі навуковых даследаванняў, якія праводзяцца ў іншых краінах. А нацыянальны крэн у многім становіцца перашкодай аб’ектыўнаму вывучэнню і разуменню ролі ўніі ў гісторыі Беларусі [2, с. 265, 275]. Аднак з аўтарам нельга цалкам пагадзіцца, бо беларускія гісторыкі не ігнаруюць вынікі тэматычных дасягненняў навукоўцаў з іншых краін.

Але таксама, як і расійскія даследчыкі, польскія – не заўважалі, або не жадалі гэта рабіць, спецыфіку канфесійнай гісторыі Беларусі, уніяцкае насельніцтва якой наўрад лі, у сваёй асноўнай масе, з-за шматлікіх пераходаў з адной канфесіі ў другую, або ў трэццюю, бачыла розніцу паміж трыма асноўнымі канфесіямі краю: каталіцтвам, уніяцтвам і праваслаў’ем.

Полацкі сабор 1839 г., як і Берасцейскі сабор 1596 г. – падзеі параўнальныя, якія з’яўляюцца вынікам палітыкі – у першым выпадку Рэчы Паспалітай, у другім – Расійскай імперыі. Асноўны удар гэтай палітыкі наносіўся па духавенству, што ж тычыцца народа, то як у першым, так і ў другім выпадку хваляванняў зафіксавана было няшмат, і то адбываліся яны пры падбухторванні прыхаджан з боку духавенства. Для практычна 100 % непісьменнага

прыгоннага сялянства ўсе тонкасці адрозненняў паміж асноўнымі канфесіямі тэрыторыі заставаліся малавядомымі, або зусім не вядомымі. Для выканання святых таінстваў і абрадаў у іх заставаўся ўсё той жа храм, усё той жа святар, і ўсё тыя ж тыя ж малітвы.

**Выкарыстаная літаратура**


1. Бубенщиков, В.В. Греко-католицька церква в етнічній історії українського та білоруського народів / В.В. Бубенщиков, П.М. Кралюк. – Львів: Сполом, 2004. – 171 с.
2. Верниковская, Е.А. Роль унии в этнокультурном развитии Белоруссии конца XVI–XVII вв. в современной белорусской историографии / Е.А Верниковская // Белоруссия и Украина. История и культура. Ежегодник. М., 2003. – С. 254-281.
3. Грыгор’ева, В.В., Завальнюк, У.М., Навіцкі У.І., Філатава, А.М. Канфесіі на Беларусі / В.В. Грыгор’ева, У.М. Завальнюк, У.І. Навіцкі, А.М. Філатава. – Мінск: Экаперспектыва, 1998. – 338 с.
4. Долбилов, М., Сталюнас, Д. Обратная уния. Из истории отношений между католицизмом и православием в Российской империи. 1840–1873 / М. Долбилов, Д. Сталюнас. – Вильнюс: Leidykla, 2010. – 276 с.
5. Западные окраины Российской империи. – М.: Новое литературное обозрение, 2006. – 603 с.
6. История русской церкви. – Т. 8. – Ч. 2. – М.: изд-во Спасо-Преобр. Валаам. мон., 1997. – 799 с.
7. Канфесійны фактар у сацыяльным развіцці Беларусі (канец XVIII–пачатак XX ст.). – Мінск: Беларуская навука, 2015. – 496 с.
8. Лісейчыкаў, Д. Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святара беларуска-літоўскіх зямель. 1720–1839 гг. / Д. Лісейчыкаў. – Мінск, Медысонт, 2011. – 198 с.
9. Лыч, Л. Рэлігія і нацыянальная свядомасць беларусаў / Л. Лыч // Беларусіка. Кн. 2. – Мінск, 1992–1993. – С. 67–69.
10. Лыч, Л. Хрысціянства ў этнакультурным жыцці Беларусі (ад старажытнасці да 1917 г.) / Л. Лыч. – Віцебск: УА “ВДТУ”, 2005. – 220 с.
11. Марозава, С. «Сваёй веры ламаць не будзем…»: супраціў дэўнізацыі ў Беларусі (1780–1839 гады) / С. Марозава. – Гродна: ГрГУ, 2014. – 218 с.

12. Марозава, С.В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596 – 1839 гады) / С.В. Марозава. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 352 с.

13. Падокшын, С.А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура / С.А. Падокшын. – Мінск: Беларуская навука, 1998. – 111 с.

14. Радзік, Р. Рэлігійныя прадумовы фарміравання беларускай мовы / Р. Радзік // Беларусіка. Кн. 2. – Мінск, 1992 – 1993. – С. 277–278.

15. Теплова, В.А. Время императора Николая I и цивилизационный поворот в судьбе Беларуси / В.А. Теплова // Россия и Беларусь: от века XIX к веку XXI. – Брест, 2004. – С. 44 – 46.

16. Терешкович, П.В. Этническая история Беларуси XIX–начала XX в. / П.В. Терешкович. – Минск: БГУ, 2004. – 223 с.

17. Токць, С.М. Барацьба вернікаў-уніятаў Гродзенскай губерні супраць скасавання уніі (30-я гг. X1X ст.) / С.М. Токць // Брэсцкай царкоўнай уніі – 400. – Брэст: БДУ, 1997. – С. 55-59.

18. Федоров В.А. Русская православная церковь и государство / В.А. Федоров. – М.: Русская панорама, 2003. – 479 с.

19. Филатова, Е.Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772–1860 гг. / Е.Н. Филатова. – Минск: Белорусская наука, 2006. – 191 с.

20. Філатава А. Скасаванне ўніі на Беларусі: гістарычнае асэнсаванне праблемы / А.М. Філатава // Наш радавод. – Гродна, 1996. – Кн. 7. – С. 372–375.

21. Швед, В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.) / В.В. Швед. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 415 с.

22. Charkiewicz, W. Zmerzch unji koscielnej na Litwie i Białorusi / W. Charkiewicz. – Slonim, 1929. – 158 s.

23. Chotkowski, W. Dziej zniweczenia św. Unii na Białorusi i Litwie i w swietle pamiątnikow Siemaszki / W. Chotkowski. – Kraków: Sp. wyd. Polska, 1891. – 205 s.

24. Likowski, E. Plan zniesienia kościóla greko-unickiego w Rosyi. Dokument historyczny / E. Likowski. – Kraków, 1882. – 12.

25. Marozawa, S. Białoruś, jesień 1838–wiosna 1839: ostatni akt unickiej tragedii / S. Marozawa // Rocznik Instytutu Europy Środkowo-Wschodniej. – Rok (4) 2006. – Lublin, 2006. – S. 53–69.

26. Mironowicz, A. Wplyw wyznań na ksztatowanie się świadomości narodowej miezkańców Białorusi w XIX wieku / A. Mironowich // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – Białystok, 2005. – S. 5–17.
27. Radwan, M. Carat wobec kościoła grecko-katolickiego w zaborze Rosyjskim. 1796 – 1839 / M. Radwan. – Roma – Lublin: PIKC, 2001. – 504 s.
28. Filatawa, A. Kościół unicki a tożsamość białorusinów (koniec XVIII–pierwsza połowa XIX wieku) / A. Filatawa // Polska – Ukraina 1000 lat sąsiedztwa. – T. 4. – Przemyśl, BACCARAT, 1998. – S. 199–202.
29. Zasztowt L. Procesy karne na ziemiach litewsko-ruskich po likwidacji unii w 1839 roku / L. Zasztowt // Przegląd Wschodni. – T. II. – Z. 3(7). – 1992/93. – S. 613–615.

## Социополитические аспекты проблемы этнической самоидентификации белорусов

Хромченко Д. Н. г. Минск, БНТУ

Проблема этнической самоидентификации белорусов представляет собой достаточно сложную и разрабатываемую на протяжении довольно длительного времени тему. Начало ее научной разработки было положено еще в XIX–начале XX вв. в трудах историков и этнографов А.Ф. Рытиха, Р.Ф. Эркерта, М.В. Довнор-Запольского, Е.Ф. Карского и др. Итогом этой работы стала попытка составления этнографических карт территории расселения белорусов. Однако расхождения в методах исследования и, как следствие, в выводах и оценках в трудах разных авторов свидетельствуют о сложности обозначения критериев и факторов, определяющих этнотерриториальные признаки белорусов. Чаще всего внимание исследователей при определении характерных черт белорусского этноса и территории расселения белорусов обращалось на такие факторы, как язык, самосознание, реже – на религиозную составляющую, причем в трудах ученых периода Российской империи проявляется своего рода двойственность: с одной стороны, признание научных данных, с другой – следование государственной политике. Возьмем, к примеру, впервые вводимую в научный оборот монографию И. Попова «Белоруссия и белорусы», изданную в 1912 г. Автор отмечает: